№ 4 (41) Вільня, стычэнь 1925 г. Цана асобнага нумару 10 грошаў.

Рабочыя і сяляне усіх краёў, злучайцеся!

ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ

ОРГАН КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.

Няхай жыве злучаная Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка!

Гэтым абвешчаем, што прадстаўнікі партыйных арганізацыяў Зах. Беларусі на сёлетняй канфэрэнцыі К.Р.П.П. ня будуць прысутнымі з прычын азначаных у Камунікаце. Таварышы-ж, якія будуць фігураваць на канфэрэнцыі як „дэлегацыя Зах. Беларусі“, у сапраўднасьці зьяўляюцца эмісарамі К.Р.П.П. у Зах. Беларусі і як зусім чуждыя рэвалюцыйнаму руху краю, ні у якім выпадку ня могуць выяўляць імкненьняў, настрояў і пераконаньняў рэвалюцыйных масаў Зах. Беларусі.

Даводзім да ведама, што Ц.К. выбраў новую рэдакцыйную калегію і газэта „Чырвоны Сьцяг“, пачынаючы з № 4, а такжа „Бальшавік“ пачынаючы з № 2 будуць выхадзіць пад новай рэдакцыяй.

КАМУНІКАТ.

ДА УСІХ СЯБРОЎ ПАРТЫІ. ДА УСІХ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН ЗАХ. БЕЛАРУСІ.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнае Партыі Заходней Беларусі, ўсебакова разгледзіўшы становішча рэвалюцыйнага руху ў этнаграфічнай Польшчы і ў акупіраванай праз Польшчу Заходней Беларусі, нашоў:

1. Нягледзючы на пастанову V кангрэса Камінтэрна аб бальшавізацыі партыі і рэвалюцыйнага руху, Ц.К. К.Р.П.П. занімаецца бясплоднымі дыскусыямі і пагразнуўшы кекшыцца ў іх; гэтым ён ўносіць гніль ў партыйныя рады, забівае ўсялякую ініцыятыву у партыйных працаўнікоў і аддаець кіраўніцтва рабочым рухам у рукі ўгадоўскіх сацыял-здрадніцкіх партыі, як Незалежная сацыялістычная партыя, П.П.С., Н.П.Р., Хадэ. Доказам гэтага зьяўляюцца ўсе апошнія забастоўкі, асабліва агульная забастоўка ў Лодзі, дзе камуністычная партыя зусім не дала свайго голасу, ня выказала сваёй дзейнасьці.

2. Па сялянскаму і нацыянальнаму пытаньнях Ц.К. К.Р.П.П. задаваліваўся агалошаньнем крыклівых пастаноў, бо на практыцы, ў жыцьці ня ў сілах зрабіць бальшавіцкую ацэнку сучасным падзеям. Пры гэтым Ц.К., калечучы і нарушаючы пастановы II зьезду К.Р.П.П. і V кангреса Камінтэрна, сваім бязчынствам дапусьціў да заснаваньня так наз. „Незалежнай хлопскай партыі“ на чале з Воевудзкім, які праслыў як палач польскай дэфэнзывы ў Менску. Ваевудзкі, ў часе польскай навалы на ўсходнюю Савецкую Беларусь, бязьлітасна расстрэліваў адважных паўстанцаў — беларускіх сялян. Незалежная хлопская партыя па сваёй сутнасьці зьяўляецца подлай падлізай пудлівай дробнабуржуазнай польскай рэакцыі, якая хаваецца пад рэвалюцыйнымі поклічамі. Гэтая партыя, апрача бесслаўнага героя польскай дэфэнзывы, складаецца яшчэ і з апалячаных беларусаў паслоў з „Вызваленьня“ і пры маўчалівай згодзе Ц.К. К.Р.П.П. працуе выключна на землях Заходней Беларусі, палёнізуе яе, ўносіць путаніцу у рэвалюцыйныя рады і падрываець уплыў К.П.З.Б. (Глядзі № 4 „Польскай Грамады“ арт. „Незалежная партыя хлопска“, які канчаецца так: „Няхай жа масы сялянства, якія да гэтага часу не парвалі са згоднікамі і здрадай вызваленцаў, пойдуць ураз-жа па сьледах правадырау (?!) „Н.П.Х“).

3. Адначасна ЦК. К.Р.П.П., ня ўмеючы па бальшавіцку манэўраваць, аказаўся зусім бязьдзейным і бязвольным, каб заўладаць рухам малазямельнага і безьзямельнага сялянства этнаграфічнай Польшчы і бяз боя аддае ініцыатыву кіраўніцтва польскім сялянствам у рукі усялякім авантурнікам і крыкунам з П.П.С., Вызваленьня, Пяста і іншым, хто спэкулюе на сялянскім руху. Паневераючы багаты досьлед Р.К.П., Ц.К. К.Р.П.П. да гэтага часу ня мае праграмы сучаснай абароны малазямельных і безьзямельных масаў сялянства этнаграфічнай Польшчы ад вызыску польскай рэакцыі. Гэтую сьвядомую незацікаўленасьць сялянскім рухам трэба асудзіць са ўсей строгасьцяй рэвалюцыйнага бальшавізма.

4. Не абмяжовываючыся этнаграфічнай Польшчай, Ц.К. К.Р.П.П. прышчапляе свой стары опортунізм (згодніцтва, мляўкасьць) і фальшывы бальшавізм на захопленую Зах. Беларусь, якая бурліць стыхійным рэвалюцыйным рухам і патрэбуе ад партыі простых і ясных адказаў на пытаньні руху. Заяўляючы красамоўна ў Сойме аддзяленьне Зах. Беларусі, Ц.К. К.Р.П.П. на практыцы лібэральнічае і адносіцца з пагардай і няверай да вызваленчага рэвалюцыйнага руху працоўных мас, бэзцючы яго у сваіх афіцыяльных выданьнях „анархіяй“, „адзічаньнем“, „бандытызмам“ і г. д. (глядзі выданьне Ц.К. К.Р.П.П. з подпісам Ц.К. пад загалоўкам „Буржуазная антываенная камэдыя“). Мала таго. Ня глядзючы на тое, што беларускае сялянства па свядомасьці і па баявой гатоўнасьці ўжо гатова ажыцьцевіць лёзунг далучэньня да Сав. Беларусі, які кінуў II зьезд К.Р.П.П., Ц.К. да гэтага часу шырока не азнайміў з гэтым лёзунгам польскія працоўныя масы і войска. Польскі рабочы, селянін і жаўнер да гэтага часу ня бачаць сваёй выгады на выпадак аддзяленьня Зах. Беларусі, не ўяўляюць супольнасьці сваіх рэвалюцыйных інтарэсаў з паўстанчым рухам беларускага сялянства і не асьведамлены аб магутнасьці, значэньні і рэвалюцыйнасьці падзей у Заходней Беларусі. А прысланыя ад Ц.К. К.Р.П.П. у Зах. Беларусь адказныя партыйныя работнікі зьяўляюцца сьляпымі праваднікамі апартуністычнай лініі Ц.К. Яны не саромючыся заяўляюць на партыйных канфэрэнцыях, пераважна сялянскіх, аб „лапіхлопстве“ і аб тым, што па іх пераконаньні масовы прыліў у партыю беларускай беднаты і баявыя выступленьні сялянскіх мас супроць насільства і проізвола акупантаў — гэта толькі „роспач“, а не рэвалюцыйнасьць — і што партыі не страшна, калі гэтыя масы адыйдуць ад яе. Гэтыя апартуністычныя і праступныя асабліва на нашым грунце заяўленьні, якія недаацэніваюць поступу рэвалюцыйнага сялянства пад панскай акупацыяй, у корані супярэчаць ясным пастановам II зьезду К.Р.П.П. Праведзеныя ў жыцьцё ў штодзённай партыйнай працы гэтыя шкодныя пахібы прыдаўляюць рэвалюцыйны паўстанчы дух у масах і угнетаюць нават старых партыйных рэвалюцыянераў, ствараючы ў іх глыбокі здаровы пратэст супроць небоездатнасьці Ц.К. К.Р.П.П.

5. Паневераючы багаты досьлед Р.К.П. у сялянскім і нацыянальным пытаньнях, неправідлова і няздатна выкарыстоўваюць варункі беларускага нацыянальнага руху, які зьяўляецца найлепшым грунтам для бальшавізацыі мас Зах. Беларусі. Далей, гэтыя прадстаўнікі Ц.К. КРПП, ствараючы сваёй палітыкай у масах разчараваньне і няверу да партыі, пнуць рэвалюцыйныя элемэнты вёскі на самастойныя арганізацыі чыста паўстанчага характару, як „Пралетарская Грамада“, „Арганізацыя імені Леніна“, „Чырвоная Звезда“. Адначасна прадстаўнікі палітыкі Ц.К. сеюць ідэолёгічную смуту ў радах партыі, выказываючы свае перакананьні, што быццам спроба беларусызацыі у Усходняй Беларусі не ўдалася, што з беларусызацыяй многа турбот і што быццам некаторыя работнікі партыі Усход. Беларусі таксама зьяўляюцца супраціўнікамі беларусызацыі. Гэткія апартуністычныя чыста мешчанскія пахібы, якія падрываюць палітыку Камінтэрна і Р.К.П. у нацыянальным пытаньні, выражаюцца на практыцы па першае ў тым, што прадстаўнікі палітыкі Ц.К. К.Р.П.П. у Зах. Беларусі падтрымліваюць і высоўваюць тыя элемэнты партыі, якія па несьвядомасьці хварэюць пераражыткамі польскай велікадзяржаўнасьці і варожа адносяцца да беларусызацыі; па другое, не хацелі выдаваць партыйны орган „Чырвоны Сьцяг“ на мове большасьці працоўнага жыхарства Зах. Беларусі, што ня удалася толькі дзякуючы таму, што месцовыя партыйныя працоўнікі рашуча запярэчылі і супроць волі прысланых ад Ц.К. К.Р.П.П. эмісараў наладзілі падпольнае выдавецтва беларускай партыйнай агітацыйнай літаратуры; па трэцяе, у нязгоднасьці Ц.К. К.Р.П.П. з поглядамі месцовых партыйных працаўнікоў на байкот польскіх школ і неразуменьне праз Ц.К. гэтага стыхійнага зьявішча, выяўляюшчага глубокую здаровую ненавісьць сялянскай баларускай беднаты да польскага клерыкальна-шляхэцкага панаваньня на Беларусі; па чацьвертае, у супраціве Ц.К. прапагандаваць у абставінах акупацыі рэвалюцыйны лёзунг беларускай народнай самаадукацыі (тайныя школы, гурткі і г. д.) і нават у простым запрэце дадатняй беларускай культурнай працы, і гэта ў той час, калі сялянства і моладзь вельмі ахвотна гэтым пранікнута і пранікаецца і ведае, што толькі абходзючы і паневераючы загады і пастановы акупантскай улады, толькі таючыся у падпольлі магчыма пладавітая работа, як культурна-прасьветная, так і палітычная, і ўсё гэта зьяўляецца здаровым адпорам супроць гвалтоўнай палёнізацыі і гэтым самым павялічвае імкненьні да аб'еднаньня с Сав. Беларусяй; па пятае, у пляновым і пастаянным адсовываньні ад кіраўнічай партыйнай работы ўсіх месцовых працаўнікоў, асабліва беларусаў, і заменай іх таварышамі, якія не разбіраюцца ў рэвалюцыйным руху края і такім чынам зьяўляюцца для гэтага руху тормазам.

6, 7 і 8 (не друкуюцца з канспіратыўных прычын).

9. У адносінах да акупіраванай тэрыторыі з пераважным літоўскім жыхарствам, якое даўно разчаравался у авантурах ковенскага кулацкага ўраду і выяўляе неаслабную зацікаўленасьць да партыі і імкненьні да рэвалюцыйнай супольнай работы, Ц.К. К.Р.П.П. і прадстаўнікі яго палітыкі ў Зах. Беларусі да гэтага часу не зьвярнулі і не зварачываюць увагі.

Прыймаючы пад увагу вышэйвыказаныя факты, якімі ураджайна апартуністычная палітыка Ц.К К.Р.П.П. і якія, узрастаючы на землях Зах. Беларусі, могуць гавясьці да гібельных для К.П.З.Б. абмылак, адрываючы яе ад рэвалюцыйнага руху мас Зах. Беларусі, Ц.К. К.П.З.Б. пастанаўляе:

З мэтай аздараўленьня рэвалюцыйнага руху ў краі адкамандзіраваць назад да Ц.К. К.Р.П.П. усіх працаўнікоў, прысланых ім у Зах. Беларусь.

Адкамандзіраваньню падлегаюць і тыя тав., якія прысланы ад Ц.К. К.Р.П.П., ўвайшлі у састаў Ц.К. К.П.З.Б. і аказаліся нездатнымі зразумець і абхапіць ва усей шырыне сучасныя патрэбы і імкненьні рэвалюцыйнага руху Зах. Беларусі.

Адначасна з гэтым Ц.К. лічыць неабходным папоўніць сябе кааптаваньнем у свой склад старых месцовых партыйных працаўнікоў.

Даводзючы аб гэтым да ведама усіх сяброў і арганізацыі К.П.З.Б., Цэнтральны Камітэт верыць, што гэты акт будзець ухвалены ўсімі арганізацыямі кампартыі Зах. Беларусі і беспартыйнымі рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі, у энэргіі і рашучасьці якіх абноўлены Ц.К. будзе чэрпаць для сябе сілу на безпашчадную барацьбу з ненавіснымі акупантамі і іх паганымі прыхвастнямі за аб'еднаньне ўсіх беларускіх земляў пад чырвоным сьцягам БССР і СССР.

Цэнтральны Камітэт
Камуністычнае Партыі Зах. Беларусі.

ПРЫВІТАНЬНЕ БРАТОУ З УСХОДУ.

Ц.К. К.П.З.Б. атрымаў з Полацку прывітаньне такога зьместу:

З глыбокаю увагаю сачыць Полацкая Акружная Партыйная арганізацыя за тою барацьбою, якую вядзе Камуністычная Партыя Зах. Беларусі і кіруемае ёю працоўнае сялянства.

На удар—удар; на панскі тэрар — аружнаю барацьбою. Правідлова пачынае дзейнічаць наша братэрская партыя. Мы верым, што гэта толькі першыя вылазкі, што за імі, навучаная вопытам Кастрычніка, наша зарубежная партыя выкарыстае Ленінскае мастацтва у масавай аружнай барацьбе.

Недалёкі час нашага злучэньня.

Гарачае прывітаньне героям-барацьбітам — беларускім паўстанцам.

Полацкая Акружная Партыйная Канфэрэнцыя.

ДА СЯЛЯН ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.

Палітычная сьвядомасьць беларускіх сялян, эканамічны вызыск і націянальны ўціск польскіх акупантаў стварылі ў Зах. Беларусі найбольшае вогнішча рэвалюцыі ў Польшчы.

Полымя гэтага вогнішча моцна падпекае пяты польскага пана, які хоча затаптаць рэвалюцыйны вызваленчы рух падняволенага краю.

Дзеля гэтага панска-ксяндзоўскі ўрад Польшчы мабілізуе ўсю сваю чорную хаўрузію, якая ўжывае здрадніцкія, крывавыя способы царскай ахранкі і Мураўёва-вешацеля. Чаго толькі паны ня прыдумаюць на безбароннага сярмяжніка! Тут і палачы генарал-ваеводы, і кругавая парука гмін, і цемры разбэшчанай паліцыі ды войска, даразныя суды, адным словам забушавала панская самаволя, ўпіўшыся мужычай крывёй.

Аднак беларускі селянін па геройску прыймае сьмерць, але ня згінаецца пакорна, на ўдар адказвае ударам.

Рады барацьбітоў большаюць і шчыльнеюць.

Але гэтыя рады польская буржуазія хоча разьбіць ня толькі белым тэрарам — яна, здрадніцкім падходам праз ганебную работу Вызваленьня, П.П.С. і іншых згоднікаў, хоча ачмуціць працоўныя масы, каб яшчэ мацней узьдзець сваё ярмо.

Толькі-ж беларускі селянін добра знае цану гэтай работы і яго парог ні адзін з гэтых панскіх паслугачоў не пасьмее пераступіць.

Тады польская буржуазія вытыкае новых стаўленьнікаў,— яна сабірае дэпутатаў Сойму з партыі Вызваленьня, пераважна апалячаных беларусаў, лепіць з іх т. наз. „Незалежную хлопскую партыю“ і надзяляе яе сабачай ласьлівасьцяй, каб змагла прылашчыцца да чырвоных бунтароў.

Беларускі селянін павінен знаць, якая гэта „хлопская“ партыя і з якімі яна лекамі прыехала з Варшавы, каб лячыць жыцьцёвыя балючкі нашых вёсак.

На чале гэтай партыі стаіць пан Воевудзкі, які мае забалочанае, бесслаўнае мінулае. Гэта выдатны польскі дэфэнзыўшчык, які праводзіў крывавую расправу ў Меншчыне. Набракшы балотам разных сацыял-здрадніцкіх партыі, п. Воевудзкі дакаціўся ўрэшце да „Незалежнай Хлопскай Партыі“, каб у імя польскага патрыятызму і імпэрыялізму выкарыстаць свой згодніцкі досьлед, каб рэвалюцыйны рух Зах. Беларусі утапіць у дробнамешчанскай каламуці.

Партыя пана Воевудзкага розным подступамі і ашуканствам хоча праціснуцца ў рэвалюцыйныя рады беларускага сялянства і, як польская партыя, баронючая непадзельнасьць Польшчы, памагаець польскаму імпэрыялізму праваліць гвалтоўную палёнізацыю Зах. Беларусі.

„Хлопска“ партыя вядзе працу выключна сярод сялян, не зьвязываючы інтарэсаў працоўных вёскі з працоўнымі гарадоў, і гэта ёсьць гібельная і праступная праца. Толькі контрэвалюцыянер нарушае сувязь рабочых і сялян, каб адхіліць пабеду над іх эксплёататарамі.

На мітынгах паны з гэтай партыі (як было ў Палачанах), хаваючы кулак у кішэні заяўлялі, што яны шмат аб чым бы расказалі, але баяцца. А калі была пададзена рэзалюцыя ад камуністаў-сялян, дык воевудчыкі таксама пабаяліся яе прачытаць. На дамаганьні сабраўшыхся паставіць гэтую рэзалюцыю на галасаваньне, паны з „хлопскай“ партыі сказалі, што ня могуць гэтага зрабіць, бо рэзалюцыя — камуністычная.

ЗАМЕСТА ВЯНКА НА МАГІЛЫ ПАУШЫХ.

Ізноў праліласі ахвярная кроў. У Слоніме каты працоўнай Беларусі забілі чатырох беларускіх сялян. Іх расстралялі не за тое, што яны былі пад Леснай. Бо усе, усе, нават азьвярэўшыя судзьі былі пэўны у тым, што ні адзін з расстэляных не прымаў ніякага удзелу у нападзе на цягнік. Усё абвінавачаньне абаснована на паказаньнях Краўчука, якога судзьі самі прызналі вар'ятом і адправілі на вылячэньне у Варшаву ў псыхіятрычную лячебніцу. Аднак ўсё ж такі сяляне аказаліся „вінаватымі" і іх забілі... Вінаваты яны аказаліся дзеля таго, што яны белалускія сяляне. Забілі іх як прадстаўнікоў гэтых сялянаў, якія ненавідзяць польскіх акупантаў і змагаюцца за злучэньне ўсіх зямель беларускіх пад чырвоным сьцягам Б.С.С.Р. Чатыры ахвяры Слоніма—гэта чарговыя ахвяры усяе Беларусі.

Сягодня у вачах усіх, хто душыць Беларусь, у вачах усіх ворагаў яе рэвалюцыйнага адраджэньня — гэтыя чатыры ахвяры — „бандыты".

Але прыдзе час, калі іх бязвестныя імены пакрыюцца славаю легенды. Лепшыя кветкі сваіх палёў прынясе уся працоўная Беларусь на іх магілы, каб прыкрыць іх. Лепшыя песьняры Дняпра, Нёмна і Буга апяюць іх у сваіх песьнях. Прыдзе час. Верце тыя, кто жывы. Змагайцеся. Будзьце гатовымі палажыць жыцьцё свае за волю, за землю і ўладу працоўных.

На удар — удар. На гвалт — гвалт.

Слава загінуўшым за волю працоўнай Беларусі.

Ц. К. Кам. Партыі Зах. Бел.

Пратэсты і абурэньне на Беларусі.

У зьвязку з Слонімскім судом над беларускімі сялянамі і расстрэлам чатырох на ўсей Віленшчыне і Горадзеншчыне адбыліся дэманстрацыі сялянаў проціў акупантаў. У Маладэчне, Лебедзеве, на Ашмяншчыне і ў іншых пунктах былі вывешаны чырвоныя сьцягі з надпісамі: „Далоў акупантаў. Далоў катаў!" „Няхай жыве Злучаная Беларуская Савецкая Рэспубліка!"

Ну, дык нечага нам тут з вамі дзяцей хрысьціць,—і разышліся.

Вось гэтая трусасьць перад паліцэйскім гузікам, ашуканства і няшчырасьць перад масамі даказвае мешчанскую натуру Военудзкага і яго хэўры ды згодніцкую палітыку іхняй партыі. Ім паслам, карыстаючымся незачэпнасьцяй, ад страху завязла ў горле сьмялейшае, жывое слова, а чаму безбаронны працоўны Зах. Беларусі, перад якім і сьмерць, і вастрог, не баіцца адкрыта выступаць ў бой з польскай буржуазіяй?

Гэта ўсё сьведчыць аб тым, што паміж рэвалюцыйнымі масамі Зах. Беларусі і т. наз. „Незалежнай хлопскай партыяй" ляжыць непраходная пропасьць.

Партыя п. Воевудзкага таксама баіцца адкрыта і аканчальна парваць з панскім парлямэнтам і лічыць патрэбным і карысным (пэўна дзеля сваёй кішэні) пустасловіць з панамі, у лепшым выпадку шкадуючы іх лаяць.

Адным словам, у Зах. Беларусі побач з генерал-воеводамі і 60-ці тысячным карацельным корпусам войска паявілася яшчэ адно безгалоўе — гэта „Незалежная хлопская партыя".

Як неўстанна і рашуча змагаемся з першым, так будзем змагацца і з другім — з „Незалежнай хлопскай партыяй".

Усіх іх вымяцім чырвонай мятлой. У нашым рэвалюцыйным поступе ня маем часу забаўляцца з шутамі польскай буржуазіі — вон іх гнаць, а ня ўступяць, дык стопчым.

Мы ведаем добра, чаго хочам і ведаем, што польскі ўрад нічога нам ня дасьць. Дык трэба браць самім, браць сілай і мы бяром пад правадырствам Камун. партыі.

Мы не баімося!

З гвалтам і беспраўем польскага ўраду, з жывадзёрствам пануючай клясы мы павінны змагацца да пабеды, да дыктатуры пралетарыяту.

Гэту пабеду зробяць толькі рабочыя ў цеснай сувязі з сялянамі, да гэтай пабеды давядзе толькі адзіная рабочая партыя,— Партыя Камуністычная.

Хто ня з намі, той проціў нас!

Прэч стаўленьнікаў буржуазіі!

Няхай жыве Камуністычная Партыя Зах. Беларусі!

Таварышы! Памятайце аб складках сяброўскіх!

СУЧАСНЫЯ ПРЫПЕУКІ.

Каб Саветаў мець управу,
Дык на Усход я пакланюся,
А на панскую Варшаву
Пляну, задам адвярнуся.

Адкапаю аднастволку,
І кліну горад на суполку —
Закапаю акупанта:
К сяндза, пана, фабрыканта.

Кінуў жонку ды начуе
Пан са стрэльбай у руках.
А як страх які пачуе,
Дык збаўленьне у нагах.

Генералы-ваяводы
Гарадзілі агароды.
Вышаў Юрка з заканурку,—
Патаптаў іх як казурка.

Акупант, ой акупант—
Ды ўсе тваё служкі,
Беларускі партызан
Дасьць вам на ігрушкі.

У цябе, вяльможна Польшча,
Кожны дмецца каб быць большы,
Знай, з мужычай Беларусі
Не пачуеш пакланюся.

Не апошні і ня першы
На крывавых гонях гіну.
Вам, буржуям, між памершых
Мсьціць і там я не пакіну.

Вокам жорава ня зловіш
І няймеш малітвай бога.
Сойм дарэмна пустасловіш—
З боем будзе перамога.

Кукарэкнуў на ўсе „крэсы"
Наш чырвоны пятушок —
Нагавіцы, інтарэсы
Пан пакінуў—ды на ўцёк...

ЖЫЦЬЦЕ ПАРТЫІ.

БАРАНАВІЦКАЯ АКРУЖНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ.

У палове лістапада адбылася II акружная баранавіцкая канфэрэнцыя Кампартыі Заходней Беларусі. На канфэрэнцыі былі прадстаўлены раёны: Косаўскі, Слонімскі, Несьвіжскі і Баранавіцкі.

Канфэрэнцыя перш чымсь пачаць сваю працу прыняла пастанову гарача вітаць палітычных арыштаваных.

З адчоту відаць, што тактыка байкоту польскае школы і масавая барацьба за беларускую школу добра прывілася асабліва у Косаўскім і Нясьвіжскім раёнах. Нават выкарыстаны для кампаній сельскія і валастныя сходы.

Іншыя тактычныя указанныя партыі, напрыклад, байкот падаткаў меней энэргічна праводзіліся у жыцьцё па двум прычынам: 1-я тактыка гэта ня зусім добра прадумана раёнамі і 2-е мала было дастаўлена адпаведнае літэратуры для мас. Апрача гэтага у Косаўскім напрыклад раёне масы чакаюць аружнага выступленьня і ня лічаць патрэбным да гэтага мамэнту вясьці менш рэвалюцыйную на іх пагляд падрыхтоўчую тактыку. Кампанія проціў белага тэрору і гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі прайшлі з вялікім посьпехам. У спрэчках падкрэсьлілі ня досыць энэргічную працу Баранавіцкага раёну.

Прадстаўнікі раёнаў крытычна ацанілі працу беларускага соймавага клюбу. Канфэрэнцыя прызнала патрэбным рашуча крытыкаваць працу гэтага клюбу, каб прымусіць пасloў праз нажым сялянскіх масаў весьці больш радыкальную тактыку, адпавядаючую інтарэсам і настроям беларускага працоўнага народу. Аднаўленьне цэнтральнага органу „Чырвоны Сьцяг" у беларускай мове баранавіцкая арганізацыя спаткала з вялікаю радасьцю. Канфэрэнцыяй разгледжаны былі арганізацыйныя пытаньні мейсцовага характару і выбраны новы акружны камітэт.

БЕРАСЬЦЕЙСКАЯ АКРУЖНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ.

На павестку дня канфэрэнцыі былі пастаўлены такія пытаньні:

1) Справаздача акружнага камітэту і Ц.К. 2) Адчот аб V кангрэсе Камінтэрна, 3) Тактыка, 4) Арганізацыйнае пытаньне, 5) Выбары акружнага камітэту і выбары на краёвую канфэрэнцыю К.П.З.Б.

Канфэрэнцыя у пачатку свае працы прыняла такую рэзалюцыю: „Берасьцейская канфэрэнцыя К.П.З.Б. горача вітае ўсіх таварышаў, якія тамяцца у засьценках буржуазнае Польшчы за справу працоўных мас. Ад імя рабочых і сялянаў абяцаемо вам, дарагія таварышы, весьці самую рашучую рэвалюцыйную барацьбу за ажыцьцяўленьне камуністычных ідэалаў і пэўны, што надыйдзе той час, калі дыктатура буржуазеі упадзе пад націскам рабочых і сялянаў і мы разам прыступім да будаўніцтва новага сьвета".

Праца канфэрэнцыі насіла дзелавы характар. Справаздача Ц.К. была поўнасьцю адобрена. Аднача з гэтым у рэзалюцыі па дакладу Ц.К. адзначана, што трэба распачаць вострую крытыку працы белар. пасloў беларускага соймавага клюбу, дзеяльнасьць каторага не адпавядае настроям беларускіх працоўных масаў, не абараняе досыць рашуча і ясна інтарэсаў бяднейшага сялянства, а невыразная тактыка яго ня толькі не дапамагае сялянскім масам самаарганізаваліцца палітычна, але наадварот выклікае непаразуменьні і хістаньні.

Канфэрэнцыя лічыць, што тактыка байкоту падаткаў, адміністрацыі, асаднікаў, барацьба за школу на роднай мове зьяўляецца у данны момант самай правільнай і мае свяёю мэтаю ня толькі сплаціць і згуртаваць сялянскія масы пад штандарамі Кампартыі, ня толькі даць выхад рэвалюцыйнаму настрою сялянства і дабіцца уступак, але таксама і закаліць масы ў пастаяннай барацьбе з акупантамі, разбіць адміністратыўны апарат, разлажыць армію, каб у больш адпаведны момант перайсьці да абароны к наступленьню, ад тактыкі байкоту да актыўнага выступленьня.

Канфэрэнцыя абгаварыла ўсе бягучыя арганізацыйныя справы і выбрала новы акружны камітэт.

ПАМАГАЙЦЕ ПАЛІТЫЧНЫМ ВЯЗЬНЯМ.

Не адна тысяча сялян і рабочых Зах. Беларусі мучыцца па гібельных вастрогах панскай Польшчы.

Гэта лепшыя барацьбіты, вырваныя белым тэрарам і рэпрэсіямі з пралетарскіх радоў, гэта ахвяры ўраду польскіх абшарнікаў і фабрыкантаў.

Лік гэтых ахвяр павялічваецца, бо рэвалюцыйны вызваленчы рух узрастае, бо панскі ўрад, прадчуваючы сваю пагібель, больш рашуча наступае, больш крывава распраўляецца з чырвонымі бунтарамі.

Але забіваючы і мучучы перадавых барацьбітоў, ня удасца польскім палачам задушыць паўстанчы рух, спыніць рэвалюцыйны поступ Зах. Беларусі.

Ударнымі хвалямі хвалюецца бурлівае мора беларускіх сялян і рабочых — з гордасьцяй трымаюць яны чырвоны сьцяг барацьбы, з таварышскім абавязкам праводзяць у жыцьцё рэвалюцыйныя думкі, пашыраюць рэвалюцыйную справу сваіх братоў, якія гібнуць па вастрогах.

І гэта ёсьць вялікая маральная дапамога і задаваленьне для палітычных вязьняў, гэтым мы прыбліжаем час іх вызваленьня.

Але гэтага мала. Ня менш пякучай справай зьяўляецца і матэр'яльнае падтрыманьне, каб зьменшыць фізычныя мукі палітычных вязьняў, зьменшыць холад і голад, які пануе па польскіх вастрогах і нязьлічоных „арыштах" па правінцыі.

Усё часьцей-гусьцей даходзіць да нас вестак з вастрогаў аб цяжкім становішчы арыштаваных. Кормяць іх скупа рэдкай гарохавай жыжкай і гнілым, зьмешаным з бульбай, хлебам. Ня менш за голад грозна дакучае і холад дзеля таго, што вастрогі, якіх хапала для царскага ураду, цяпер на столькі перапоўнены, што прыходзіцца спаць на каменнай сырой падлозе без адпаведнай пасьцелі ў нятопленых камерах.

Ад пастаяннага недаяданьня, ад сырасьці і холаду шмат хварэе і паміраe па вастрогах нашых братоў, якія складаюць у ахвяру сваё жыцьцё і здароўе ў барацьбе за нашыя правы, за нашу долю.

Усё гэта стварае вострую і неадкладную патрэбу арганізаваць масавую матэр'яльную пастаянную дапамогу палітычным вязьням, у якой павінны прыняць гарачае учасьце ўсе партыйныя арганізацыі і ўсе працоўныя Зах. Беларусі.

Кожны селянін і рабочы павінен падзяліцца хоць з сваім апошнім кавалкам, каб дапамагчы нашым братом а зьлейшым ворагам польскага ўраду. Дапамагой гэтай мы ня толькі ратуем барацьбітоў рабочае клясы, але і адначасна выказваем пагарду і ненавісьць да нашых эксплёататараў і жывадзёраў.

Трэба пасьпяшыць з дапамогай, бо хто дае ў час, той у колькі разоў больш дае.

Няхай рабочы і селянін перш чым выдаць грош на гарэлку ці іншую непатрэбшчыну, успомніць цяжкі лёс многіх ахвяр буржуазіі і адложа гэты грош на падтрыманьне жыцьця вязьня.

Дык у імя дапамогі вязьням кінем і правядзём у жыцьцё поклічы:

Далоў п'янства, ад якога карысьць толькі нашым ворагам.

Далоў вясельлі, хрэсьбіны, касьцельныя і царкоўныя ахвяры, з якіх толькі нарастае сала на ксяндзох і папох.

Дык паратуем палітычных вязьняў, бо і кожны з нас, жывучы пад грабежным і бесправным панскім урадам, можа быць арыштаваны, можа стацца ахвярай ворагаў, холаду і голаду.

Трэба памятаць, што апрача нас самых ніхто больш нас не паратуе, не паможа.

Партыйныя т. т. павінны выказаць дзейнае ўчасьце па арганізацыі пастаяннай помачы для арыштаваных.

Кожная вясковая ячэйка павінна выдзяліць двух, трох т. т., якія павінны спэцыяльна заняцца помачай палітычным арыштаваным. Праца гэтых т.т. будзе:

1. Зьбіраць грошы, прадукты, бялізну, вопратку, абуўку і іншае для перадачы арыштаваным непасрэдна ці праз районныя камітэты.

2. Неадкладна паведамляць районныя камітэты аб арыштах, аб якіх даведалася ячэйка. Дзеля гэтага трэба даць точны адрас арыштаванага, імя, прозьвішча і колькі гадоў, жанаты ці дзяцюк, колькі дзяцей, чым занімаўся, што знойдзена пры арышце і прычыны выклікаўшыя арышт.

Усё гэта неабходна ведаць цэнтральнай партарганізацыі, каб паклапоціцца аб юрыдычнай і матар'яльнай дапамозе. Бывала часта так, што рэвалюцыянеры доўгі час гібелі па вастрогах і аб іх, з прычыны няхайнасьці некаторых т.т., ніхто ня ведаў, а гэта ўсё на руку нашым палачом. Помач вязьням, як і кожная грамадзкая праца, павінна апірацца на самыя шырокія масы.

13-га чэрвеня 1923 г. у Вільні на кватэры Мацея Юшкевіча паліцыя нашла друкарню кампартыі. Палякі асудзілі яго на шэсьць гадоў катаргі. Ц.К. К.П.З.Б., чуючы маральны абавязак памагаць Юшкевічу, які ня будучы сябром партыі, церпіць аднак па яе віне, прыймаючы такжа пажылыя гады Юшкевіча і нэндзу яго сям'і, гэтым зьвертаецца да рабоча-сялянскага ўраду Савецкай Беларусі з просьбай вымяніць Юшкевіча на якога небудзь бела-паляка.

Ад Т-ва Дапамогі Палітыч. Арышт. Зах. Беларусі.

Праўленьне падцьвярджае паступленьне у касу Таварыства ніжэй пададзеных сумаў за сьнежань месяц 1924 году.

Па лістам №№:

26	31.50	197	4.60	257	22.20	339	5.—	416	5.85
38	6.50	212	11.70	259	10.—	345	14.—	418	4.—
39	10.90	213	2.20	261	13.75	356	3.—	422	19.—
43	6.50	214	8.—	301	30.—	357	6.—	423	20.—
166	38.15	216	24.—	304	6.—	358	9.—	424	24.—
187	10.—	240	44.—	310	5.25	359	56.40	425	28.—
188	5.—	248	13.50	334	4.95	360	73.30		
191	9.50	249	40.—	335	2.—	372	38.65		
193	11.—	250	14.70	338	7.35	373	18.—		

Індуры тал. № 51 — 25 зл., М. Ш. тал. № 53 — 20 зл., Сувалкі—32 зл. 30 гр., 2 зл., 2 зл., 50 гр. і 3 зл. 20 гр. Беларуская моладзь 10 зл., Без ліста 1 зл 45 гр., Бельск без лістоў 52 зл. 5 гр. Усяго за сьнежань (апрача Берасьцейскага і Баланавіцкага Аддзелаў і Маладэчынскага Пададдзела, якія адчотаў яшчэ ня прыслалі) **865 зл. 95 гр.**

Падцьвярджаюцца старыя лісты з Беластоку: № 14—26 зл. 1 гр. і № 192—63 зл. 75 гр.

Таварыства Дапамогі Палітычным Арыштаваным Заходней Беларусі гэтым зьвертаецца да арганізацыі МОПР-а у Савецкай Беларусі з просьбаю частку з зьбіраемых ёю сумаў перадаць беспасрэдна у Т-ва, мінуючы Варшаўскі аддзел МОПР-а.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

ВІЛЬНЯ, ДРУКАРНЯ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.